719 (476)
К31

Рэспубліканскі савет
Беларускага таварыства
аховы помнікаў гісторыі і культуры

# Каштоўнасці мінуўшчыны 6

## Гістарычныя цэнтры гарадоў Беларусі: праблемы і шляхі іх вырашэння

*Матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі Мінск, 28 лістапада 2002 г.*

Президентская библиотека
Республики Беларусь
2 003000 027266

Мінск «Зна...» 2003

***Ю.Ю.Захарына***

## Роля гісторыка-архітэктурнага фактару ў забудове грамадскіх цэнтраў гарадоў Беларусі 1970–90-х гадоў

Адной з праблем у сістэме горадабудаўнічых вырашэнняў 1970-90-х гадоў стала пытанне далейшага развіцця грамадскіх цэнтраў, паляпшэнне іх архітэктурна-мастацкага аблічча і ўдасканаленне архітэктурных ансамбляў гарадскіх магістраляў. З прычыны, што цэнтр горада з'яўляецца яго планіровачным ядром, узнікла праблема забеспячэння насельніцтва жыллём, развіцця сістэмы абслугоўвання, арганізацыі транспартна-камунікацыйнай сістэмы.

Пры праекціроўцы гарадоў архітэктары імкнуліся да найболын мэтазгоднага размяшчэння жылых, грамадскіх і прамысловых будынкаў, улічваючы пры гэтым зручнасць транспартных сувязяў. Будаўніцтва гарадоў у гэты час адбываецца зыходзячы з вырашэння двух найбольш важных пытанняў: размяшчэння аб'ектаў з улікам перспектывы і рацыянальнага выкарыстання тэрыторыі [1, с. 36]. Найбольш яскрава гэтая тэндэнцыя адбілася на забудове абласных цэнтраў – Мінска, Брэста, Гродна, Віцебска, Гомеля і Магілёва, а таксама іншых буйных гарадоў рэспублікі.

У структуры развіцця грамадскіх цэнтраў гарадоў вялікае значэнне адыграла арганізацыя транспартных сувязяў, якая вылучаецца ў якасці самастойнага фактару мастацкай выразнасці. Немалаважнай задачай фарміравання гарадскога асяроддзя стала павышэнне эстэтычных якасцяў забудовы, стварэнне магістраляў, плошчаў, разнастайных па свайму архітэктурнаму абліччу і выразнасці. Спосаб фарміравання прасторы звязаны з тыпам руху, які непасрэдна ўплывае на памеры і прапорцыі дарог і плошчаў. Важную ролю адыгрывае форма, асноўныя члянненні фасадаў, сілуэт будынкаў, размешчаных уздоўж пешаходных і аўтамабільных дарог,

а таксама ландшафт [2, с. 123–124].

Цэнтры гарадоў, асабліва вялікіх і буйных, насычаны транспартам, што пагаршае стан навакольнага асяроддзя і пагражае бяспецы пешаходаў. Арганізацыя пешаходных вуліц, плошчаў і вялізных пешаходных зон з'яўлялася адной з актуальных праблем горадабудаўніцтва ў савецкія часы; застаецца яна гэтакай і сёння. У беларускім горадабудаўніцтве вызначыўся шэраг прыёмаў арганізацыі пешаходных зон: пераўтварэнне асобных вуліц у пешаходныя і фарміраванне новых пешаходных вуліц; арганізацыя шляхам рэканструкцыі ўнутрыквартальных пешаходных сувязяў з насычэннем іх грамадскімі функцыямі; вертыкальнае зaніраванне пешаходнай вуліцы і транспартнай магістралі; арганізацыя пешаходных плошчаў, а таксама пешаходных зон на іх; вертыкальнае зaніраванне тэрыторыі цэнтраў з поўным падзелам транспарту і пешаходных сувязяў; стварэнне пешаходных цэнтраў-эспланад; будаўніцтва на галоўных вуліцах шляхам рэканструкцыі ізаляваных ад праездаў тратуараў з адпаведным пераўтварэннем асяроддзя [3, с. 181–183]. Арганізацыя пешаходных зон мела на мэце і захаванне гістарычнай забудовы. Таму ў першую чаргу фарміраванне пешаходных вуліц ці пераўтварэнне аўтатранспартных магістраляў у пешаходныя пачало здзяйсняцца ў гістарычных цэнтрах гарадоў (вул. Чапаева ў Лідзе, вул. Савецкая ў Гродне, вул. Савецкая ў Брэсце, пешаходная зона на галоўным адрэзку праспекта Машэрава ў Мінску і інш.).

Структура горада ў адзінстве мастацкага і архітэктурна-планіровачнага вырашэння ў многім вызначаецца сістэмай грамадскіх цэнтраў, дзе групіруюцца будынкі разнастайных па функцыянальнаму зместу ўстаноў, што дазваляе забяспечыць комплекснае і зручнае абслугоўванне жыхароў. Арганізуючая роля грамадскага цэнтра ў значнай ступені вызначаецца ўзаемасувяззю яго планіровачнай структуры і структуры асноўных кампазіцыйных восей горада – гарадскіх дыяметраў, галоўных ландшафтных восей. Пры гэтым існуюць адроз-

ненні планіровачнай структуры буйных і малых гарадоў. Калі для малых гарадоў заканамерны монацэнтрычныя кампактныя грамадскія цэнтры, то для вялікіх і буйных гарадоў – поліцэнтрычныя лінейна-восевыя кампазіцыі, якія дадаюцца на перспектыву зорчатай ці веернай структурай цэнтраў планіровачных раёнаў. Зорчатая структура выкарыстоўваецца на аснове існуючай радыяльна-кальцавой планіроўкі грамадскага цэнтра (Мінск, Гомель, Віцебск), веерная – у тых выпадках, калі цэнтральнае ядро ў плане горада размешчана асіметрычна і зрушана да водных прастораў (Брэст, Пінск) [3, с. 30–31].

Тэрытарыяльнае развіццё гарадоў, выкарыстанне ўнутрыгарадскіх рэзерваў, улік склаўшыхся горадабудаўнічых, у тым ліку прыродных умоў, з'яўляюцца важным фактарам у пераўтварэнні гарадскога асяроддзя. Для Мінска гэты пошук адлюстраваны ў генеральным плане і заключаны ў паступовым ператварэнні радыяльна-кальцавой планіроўкі ў больш сучасную для буйнога горада сістэму [4, с. 36].

Па генеральным плане, распрацаваным інстытутам «Мінскпраект», грамадскі цэнтр сталіцы рэспублікі атрымаў зорчатую структуру, пры якой цэнтральнае ядро праз сістэму галоўных радыяльных вуліц-праспектаў аб'яднана з цэнтрамі планіровачных раёнаў. Дадаткова да асноўнай магістралі горада – пр. Ф.Скарыны – другой кампазіцыйнай воссю цэнтра стаў водна-паркавы зялёны дыяметр, які ўтварыўся ўздоўж поймы ракі Свіслач, замацаваны двума паркавымі паўкольцамі ўздоўж ручаёў Сляпянкі і Лошыцы. З ростам самаго горада з'явілася магчымасць развіцця цэнтра ўздоўж водна-зялёнага дыяметра і сумяшчэння цэнтраў планіровачных раёнаў і планіровачных зон з праектуемым водна-зялёным кальцом. Такім чынам былі створаны перадумовы для актыўнага ўключэння ландшафта ў кампазіцыю. Так, калектывам архітэктараў (Я.Дзятлаў, Ю.Градаў, Л.Левін, Я.Заслаўскі, В.Сярогіна, Г.Горына, Я.Ліневіч, Л.Патапаў, І.Кароль, В.Анікін, Г.Фадзеева,

А.Брэгман і інш.) быў вызначаны прынцып архітэктурна-прасторавай кампазіцыі забудовы, сістэма арганізацыі горадабудаўнічых ансамбляў.

Далейшае развіццё цэнтра здзяйснялася ў паўночна-заходнім накірунку зоны водна-зялёнага дыяметра, што стала вынікам рэканструкцыі шэрагу прадпрыемстваў у ядры цэнтра. У 1980-я гады ў гарадское ядро ўвайшлі галоўны адрэзак пр. Скарыны з плошчамі Незалежнасці, Кастрычніцкай і Перамогі; ансамбль Прывакзальнай плошчы; галоўны адрэзак пр. Машэрава з датычнай да яго водна-зялёнай зонай; стадыён «Дынама» і парк, абмежаваны вул. Кірава, Свярдлова; гістарычная зона ў раёне плошчы Свабоды і Траецкага прадмесця; сістэма паркаў уздоўж водна-зялёнага дыяметра. Ужо ў 1980-я гады ў Мінску сфарміравалася разгалінаваная шматвузлавая структура цэнтральнага ядра.

Вялікую ролю ў далейшым развіцці горада адыгрывае ідэя захавання прыродна-ландшафтнай зоны. Перспектыўны генплан прадугледжвае далейшую распрацоўку арганізацыі зялёнага дыяметра вакол ракі Свіслач. Ён працягвае лінію зялёных прастораў у сістэме забудовы паўночнага і паўднёва-заходняга раёнаў. Структура водна-зялёных зон у будучыні мяркуе ўдасканаленне і далейшае фарміраванне Лошыцкай і Сляпянскай водных сістэм. У значнай ступені рэалізаваны і спецыяльныя праекты па стварэнню вакол Мінска кальца зон адпачынку, групіруемых каля вадасховішчаў рэк Вяча, Волма, Пціч і іншых, дзе вырашана праблема захавання прыродных ландшафтаў [5, с. 4].

Перспектыўны генплан развіцця Мінска ўключае праектныя вырашэнні раёнаў з індывідуальнай забудовай, якія выходзяць за межы кальцавой аўтадарогі. Праект уключае чатыры планіровачныя зоны ўнутры гарадскога ядра, размежаваныя другім гарадскім кальцом і чыгуначнымі лініямі. Унутры гэтых зон знаходзяцца трыццаць пяць планіровачных раёнаў, падзеленых сістэмай водна-зялёных прастораў і магістральных вуліц. Кожны з іх мае сваю ўнутраную структуру са



Прэзідэнцкая бібліятэка
1406082
Рэспублікі Беларусь

сфарміраванымі жылымі і грамадскімі раёнамі, якія, у сваю чаргу, пры дапамозе добраўпарадкаванай сістэмы вулічнай сеткі падзяляюцца на больш дробныя горадабудаўнічыя адзінкі – мікрараёны і кварталы. Пры гэтым цэнтральны гарадскі раён захоўвае сваю гістарычную функцыю з размешчанымі ўстановамі агульнагарадскога прызначэння.

Агульнае архітэктурна-мастацкае аблічча гарадскога ядра вызначаюць дзве буйнейшыя перакрыжаваныя магістралі – пр. Машэрава і пр. Скарыны, у межах якіх фарміруецца кампазіцыя цэнтра Мінска. Яны дадаюцца сістэмай іншых кампазіцыйных восей асноўных радыяльных накірункаў, што разыходзяцца ад цэнтра і з'яўляюцца структурна-планіровачнымі восямі перыферыйных зон. Ствараючы шляхам перакрыжавання з другім кальцом горада транспартна-камунікацыйныя вузлы, яны атрымліваюць далейшае развіццё па накірунку магістраляў, дзе ўтвараюць развязкі. Менавіта ў гэтых зонах прадугледжваецца размяшчэнне новых раёнаў малапавярховай індывідуальнай забудовы. Гэтыя раёны ўмоўна атрымалі назву адпаведна размешчаным побач з імі населеным пунктам – Сёмкава, Юзуфава, Вішнёўка, Астрашыцкі Гарадок, Каралёў Стан, Сокал, Прывольны, Міханавічы, Пяцеўшчына-Крупіца, Фаніпаль, Гарадзішча, Ляхаўшчына-Хатэжына, Заслаўе. У праекце мяркуецца звязаць гэтыя раёны між сабой акружной магістраллю на аснове ўжо існуючых і дзейнічаючых транспартных шляхоў [6, с. 9–10]. Пры гэтым паўднёвыя раёны, якія знаходзяцца ў межах лесапаркавага масіву, маюць, у асноўным, сельскагаспадарчае прызначэнне і ў межах горадабудаўнічых задач могуць служыць цэнтрамі стварэння цікавых, выразных прыродна-ландшафтных тэрыторый.

Выяўленне прыродна-рэльефных асаблівасцяў, уплыў гісторыка-архітэктурнага фактару пры фарміраванні гарадской забудовы характэрны і для іншых гарадоў Беларусі. Аснова планіровачнай структуры існуючага гістарычнага цэнтра Гродна складаецца з сістэмы вуліц

Ажэшка, Савецкая, Маставая і плошчаў Леніна, Прывакзальнай і Савецкай. У структуру гістарычнага цэнтра ўвайшлі таксама прыродныя ландшафты, уключаючы пойму ракі Гараднічанка, Замкавую гару і крутыя схілы берагоў Нёмана. Вуліца Савецкая пры гэтым была пераўтворана ў пешаходную.

Папаўняецца выразнымі вырашэннямі цэнтральны раён горада Брэста. Структура ядра агульнагарадскога цэнтра горада ў 1980-я гады яшчэ не мае дакладных планіровачных межаў. У яго склад уваходзяць галоўная вуліца Леніна з плошчай Леніна, у раёне якой сфарміраваўся адміністрацыйна-грамадскі комплекс абласнога значэння; асноўная магістраль горада – вуліца Маскоўская з шэрагам планіровачных вузлоў; пешаходная гістарычная зона па вуліцы Савецкай з гандлёвымі прадпрыемствамі і відовішчнымі ўстановамі. Ядро цэнтра сумяшчаецца са ствараемым уздоўж ракі Мухавец водна-зялёным дыяметрам. Неад'емнай часткай цэнтра стаў мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць». Адміністрацыйная зона цэнтра развіваецца на захад і на поўдзень ад плошчы Леніна. Уся тэрыторыя, якая знаходзіцца на захад ад вуліцы Леніна, пераўтвараецца ў вялізную паркавую зону. Такім чынам паступова ў Брэсце складваецца поліцэнтрычная структура агульнагарадскога цэнтра. Асобныя індывідуальныя кампазіцыі ўключаюцца ва ўжо складзеную забудову. Такія прыклады маюцца ў жылым раёне па бульвары Касманаўтаў, на перакрыжаванні вул. Маскоўскай і бульвара Касманаўтаў. Пластычнае вырашэнне фасадаў, каларыстычнае насычэнне ў аздабленні будынкаў вылучаюць іх сярод кампазіцыі і ўзбагачаюць архітэктурнамастацкае асяроддзе новымі маляўнічымі вырашэннямі. Звычайна такія унікальныя аб'екты ставяцца ўздоўж магістраляў, нібыта хаваючы аднатыповую забудову папярэдняга дзесяцігоддзя.

Выразным рэльефам адрозніваецца цэнтр Віцебска, структура якога ўключае адрэзкі галоўных гарадскіх дыяметраў – вуліцы Леніна з плошчамі Леніна, Пера-

могі і гістарычнай плошчай Свабоды; Кірава-Замкавай, перпендыкулярнай вуліцы Леніна, з плошчамі Вакзальнай і 1000-годдзя Віцебска. Асаблівасцю цэнтра горада з'яўляецца адсутнасць паўнацэннай у функцыянальных і мастацка-эстэтычных адносінах галоўнай плошчы. Плошча Леніна, якая выконвае гэтую ролю, знаходзіцца на перыферыі цэнтральнага ядра і не адпавядае свайму прызначэнню. У значнай ступені вырашыць гэтую праблему дапамагло стварэнне на перакрыжаванні двух асноўных гарадскіх дыяметраў – вуліц Леніна і Фрунзе, на месцы былога стадыёна, – шматмэтавага грамадскага форума з арыгінальным эстрадным комплексам. Развіццё архітэктурна-планіровачнай структуры грамадскага цэнтра здзяйсняецца і за кошт актыўнага асваення пешаходных прыбярэжных тэрыторый Заходняй Дзвіны.

Вялікую цікавасць выклікае вертыкальнае заніраванне тэрыторыі цэнтра горада з арганізацыяй на ніжнім ландшафтным узроўні сістэмы развітых пешаходных сувязяў, якія аб'ядноўваюць асобныя ансамблі цэнтра з водна-зялёным дыяметрам і пешаходнымі набярэжнымі. Пешаходная зона тут склалася з двух узроўняў: верхняга – шырокага тратуара з кветнікамі і ніжняга (уздоўж вул. Леніна), звязанага з верхнім узроўнем спускамі, аздобленымі малымі архітэктурнымі формамі.

Удасканальваецца і структура цэнтральнага ядра Гомеля. Калі ў 1970-я гады агульнагарадскі цэнтр меў даволі замкнутую структуру, пры якой галоўныя вуліцы і магістралі адначасова выконвалі ролю і транспартных артэрый, у 80-я гады фарміруецца поліцэнтрычная структура, пры якой прадугледжваецца актыўны выхад цэнтра да ракі, сумяшчэнне яго з водна-зялёным дыяметрам. Праектам дэталёвай планіроўкі цэнтра, распрацаваным Гомельграмадзянпраектам у 1980 годзе, прадугледжваецца абходная хуткасная аўтамагістраль, рэгенерацыя плошчы Леніна ў пешаходную.

У Магілёве архітэктурна-планіровачная структура агульнагарадскога цэнтра, згодна з праектам дэталёвай планіроўкі, распрацаваным БелНДІПгорадабудаўніцт-

ва ў 1988 годзе, развіваецца пераважна ўздоўж другога фарміруемага кампазіцыйнага дыяметра горада – праспекта Міру. На высокім беразе ракі пракладваецца новая магістраль, якая звязвае ядро з усходнім і заходнім раёнамі праз вуліцу Бурдзенка і бульвар Юбілейны. У межах цэнтральнага ядра завяршаецца рэканструкцыя вуліцы Першамайскай. Сістэма вышынных дамінант, стварэнне якой вядзецца ў гэтым раёне, разлічана на візуальнае выяўленне цэнтральнага ядра з боку прылягаючых раёнаў і ўзмацненне мастацкай выразнасці забудовы ў межах самаго ядра.

У вялікіх гарадах Беларусі паступова фарміруецца разгалінаваная шматвузлавая структура агульнагарадскіх цэнтраў. Аднак пры хуткіх тэмпах развіцця маюцца недахопы як з функцыянальнага пункту гледжання, так і з эстэтычнага. Прыкладам у гэтым сэнсе можа служыць агульнагарадскі цэнтр у Баранавічах (1980). Значны рост транспарту, недастатковая шырыня вул. Савецкай прывялі да неабходнасці перапланіроўкі структуры агульнагарадскога цэнтра. Грамадскі цэнтр Баранавіч сфарміраваны ў складзе вул. Савецкай з плошчай Леніна і вул. Леніна, а таксама развітага планіровачнага вузла па вул. Савецкай. Галоўнымі кампазіцыйнымі восямі цэнтра з'яўляюцца вул. Чарнышэўскага і Савецкая, якія, перакрыжоўваючыся, утвараюць новую галоўную грамадскую плошчу. Праектам дэталёвай планіроўкі прадугледжана звязаць новы і існуючы цэнтр пешаходнай зонай, што ў многім вырашыць функцыянальныя і архітэктурна-мастацкія пытанні, перш за ўсё звязаныя з арганізацыяй камунікацый.

Болып традыцыйным для Беларусі з'яўляецца развіццё агульнагарадскога цэнтра Барысава. Існуючы цэнтр утвораны побач з ракой Беразіной, на перакрыжаванні пр. Рэвалюцыі і вул. Чапаева, дзе створана галоўная плошча, каля якой сфарміраваны шэраг планіровачных вузлоў. Асноўнымі недахопамі з'яўляецца тое, што фактычна цэнтр адрэзаны ад воднай зоны прадпрыемствамі, пешаходныя зоны адсутнічаюць. Згодна з

новым генпланам прадугледжваецца рэканструкцыя цэнтра шляхам выхаду яго пешаходнай зонай да водна-зялёнага дыяметра; асобныя функцыянальныя зоны плануецца размясціць на процілеглым беразе ракі.

Аб'яднанне агульнагарадскога цэнтра з водна-зялёным дыяметрам можна бачыць і на прыкладзе Бабруйска. Ядро цэнтра ўтворана вуліцамі Мінскай, Урыцкага, Інтэрнацыянальнай і Кастрычніцкай. Асноўныя магістралі горада ўваходзяць у гістарычную радыяльна-прамянёвую структуру цэнтра, закладзеную ў планах крэпасці ў 1811 г. Праектам дэталёвай планіроўкі (1989) прадугледжана захаванне гістарычнай забудовы цэнтра шляхам стварэння пешаходнай зоны, першым этапам фарміравання якой стала арганізацыя мемарыяльнай пешаходнай плошчы Перамогі.

Адной з лепшых плошчаў агульнагарадскога цэнтра з'яўляецца плошча Леніна ў Маладзечне, раскрытая ў бок парку. Галоўную вуліцу плошчы – вул. Прытыцкага плануецца пераўтварыць у пешаходную. Згодна з праектам дэталёвай планіроўкі (1986), у парку плануецца стварыць мемарыяльны комплекс, на пр. Леніна – шэраг планіровачных вузлоў.

Захаванне гістарычнай забудовы цэнтра можна бачыць на прыкладзе Мазыра. Агульнагарадскі цэнтр утвораны вуліцамі Ленінскай, Пушкіна, Люксембург. Асноўная гістарычная забудова засяроджана ў раёне галоўнай плошчы, набярэжнай, утворанай вул. Савецкай, і прыбярэжнай паласы. Генплан прадугледжвае стварэнне новых комплексаў, якія размесцяцца ўздоўж галоўнай магістралі Калінкавічы – аэрапорт. З мэтай захавання гістарычнай забудовы і унікальнага рэльефа палескай мясцовасці плануецца адпаведнае функцыянальнае заніраванне тэрыторыі, аддзяленне транспартнай сістэмы ад пешаходнай, фарміраванне цэласных архітэктурных ансамбляў.

Арганізацыя пешаходнай зоны плануецца і праектам дэталёвай планіроўкі цэнтра і водна-зялёнага дыяметра Оршы (1982). Існуючы цэнтр горада ўтвораны

вуліцамі Леніна, Міру, Астроўскага і Камсамольскай, у межах якіх знаходзіцца галоўная плошча – плошча Леніна. Асноўнымі недахопамі арганізацыі цэнтра, якія пераадольваюцца на ступені генплана, з'яўляюцца адсутнасць пешаходных зон, цэнтр не раскрыты ў бок Дняпра, каля якога ён знаходзіцца.

У вялікіх гарадах, асабліва ў Пінску, Полацку і Лідзе, маецца каштоўная гістарычная забудова, тут праводзіцца рэгенерацыя і рэканструкцыя цэнтраў і гістарычных комплексаў. Пытанне гарадской забудовы ў Пінску вырашаецца ў пэўнай стылістычнай лініі, дзе ў асобных кварталах з'яўляецца недапушчальным «вкрапленне инородных тел» [7, с. 2]. Ядро агульнагарадскога цэнтра Пінска развіваецца ў асноўным ва ўсходнім і часткова ў заходнім накірунках уздоўж ракі Піны. Прадугледжваецца веерападобная поліцэнтрычная структура цэнтра. Гістарычны цэнтр пераўтвараецца ў пешаходную зону, а асноўныя патокі транспарту прадугледжваецца пусціць у абыход ядра, па паўкальцавой магістралі.

Самастойныя цэнтры маюць і гарады Полацк і Наваполацк. У сувязі з плануемым аб'яднаннем іх у адзін горад прадугледжваецца фарміраванне новага ядра агульнагарадскога цэнтра паміж водна-зялёным дыяметрам уздоўж Заходняй Дзвіны і будучай галоўнай вуліцай горада. Сучасныя цэнтры Полацка і Наваполацка на будучыню мяркуецца пераўтварыць у планіровачныя раёны. Такім чынам магчыма сфарміраваць поліцэнтрычную планіровачную структуру цэнтра, узаемазвязаную з водна-зялёным дыяметрам. На гэтую галоўную ландшафтную вось выходзяць існуючыя цэнтры гарадоў [3, с. 49].

Спалучэнне гістарычнага і новага ў забудове гарадоў добра праглядаецца на прыкладзе ансамбля цэнтра Салігорска. У яго лінейную структуру ўвайшлі вул. Леніна, плошча Леніна і эспланада, якая вядзе ад плошчы да прыбярэжнага парку з вадасховішчам. Характэрнай асаблівасцю цэнтральнай часткі Салігорска з'яўляецца непарыўная сувязь забудовы з прыродным асяроддзем і

штучным ландшафтам. Сам спакойны раўнінны рэльеф мясцовасці вызначыў прынцып фарміравання сілуэта горада з вылучэннем вышынных архітэктурных акцэнтаў. Асновай горадабудаўнічага вырашэння ансамбля цэнтра горада з'явілася адміністрацыйная плошча з развітай сістэмай вуліц. Непасрэдна на самой плошчы размешчаны будынак гарсавета і Палац культуры, што адпавядае яе функцыі. Два жылыя дамы, якія маюць гарызантальнае размяшчэнне, абмяжоўваюць плошчу з боку вул. Казлова. Вялікае значэнне ў структуры арганізацыі цэнтра мае вялізны гарадскі бульвар, які пераходзіць у прыродны лясны масіў, да якога адкрываецца плошча. З гэтага боку знаходзіцца вышынны будынак кіравання вытворчага аб'яднання «Беларуськалій» і манумент Леніну. Гістарычная забудова ўдала спалучаецца з узведзенымі на сучасным этапе 20-павярховымі будынкамі з супадпарадкаванымі чатырма жылымі дамамі павышанай павярховасці, размешчанымі ўздоўж эспланады. Так, спалучэнне гістарычнага і новага ў забудове спрыяе стварэнню архітэктурна-мастацкага аблічча цэнтральнай часткі і горада ў цэлым [8, с. 12–13].

Архітэктурна-планіровачная арганізацыя горада дыктуецца яго традыцыямі, гістарычнымі ўмовамі, прыроднымі і тэрытарыяльнымі асаблівасцямі, а таксама велічынёй і значнасцю горадабудаўнічых адзінак. Таму перад архітэктарамі заўсёды стаяла задача пераемнасці прынцыпаў і традыцый у забудове. Пры фарміраванні новай забудовы ўлічваўся шэраг гістарычных, сацыяльных і архітэктурна-планіровачных фактараў. Увага надавалася традыцыйным прыёмам арганізацыі вулічнай сеткі, архітэктары прытрымліваліся маштабнай суразмернасці новых архітэктурных утварэнняў старым. Пры ўзвядзенні новай забудовы ўлічвалася і тое, што яе пэўная функцыянальная накіраванасць патрабуе выкарыстання адпаведных тыпаў будынкаў.

Аснову развіцця планіровачнай структуры грамадскіх цэнтраў гарадоў Беларусі ў 1970–90-я гады найбольш яскрава вызначылі існуючыя прыродна-ландшафтныя

ўмовы і транспартныя камунікацыі. З мэтай захавання гістарычнай забудовы гарадоў рэспублікі ў многіх выпадках была прадугледжана арганізацыя пешаходных зон, што дазволіла вызваліць цэнтральныя раёны ад перагружанасці гарадскім транспартам.

1. Посохин М.В. Город для человека. – М., 1980. – С. 219.
2. Новаковский М. Транспорт и проектирование центра города: Пер. с польск. – М., 1978. – С. 202.
3. Общественные центры городских населенных мест БССР (опыт формирования, проблемы и направления развития) / Е.Л.Заславский, Ю.В.Чаитурия, О.В.Базакуца, А.Е.Роговин; Под общ. ред. Е.Л.Заславского. – Мн., 1991. – С. 215.
4. Лысенко А.В. Проблемы улучшения городской среды на примере Белоруссии // Строительство и архитектура Белоруссии. – 1973. – № 2. – С. 34–36.
5. Сычева А., Поттосина Л. Жилищное строительство: проблема охраны природных ландшафтов // Архитектура и строительство. – 1996. – № 2-3. – С. 4–6.
6. Москалевич Л. Архитектурная мастерская: опыт творчества // Архитектура и строительство. – 1996. – № 2-3. – С. 9–16.
7. Василенко О. Формирование архитектурного облика города – процесс творческий // Архитектура и строительство. – 1998. – № 3. – С. 2–4.
8. Заславский Е.Л. Архитектурный ансамбль центра Солигорска // Архитектура и строительство. – 1996. – № 1. – С. 11–13.

*И.Л.Петрик*

## Культурные ценности как правовая категория

Концепцией национальной безопасности Республики Беларусь определены жизненно важные интересы нашей страны в гуманитарной сфере, в частности сохранение культурного наследия. Отношение белорусского общества к этой важной проблеме находит также отражение в созданной комплексной системе нормативных актов, направленных на сохранение культурного наследия, воплощенных в Конституции Республики Беларусь, Уголовном кодексе и Кодексе об административных правонарушениях, в законах Республики Беларусь «О культуре» (1991), «Об охране историко-культурного на-